# ЗНЕШНЯЯ ПАЛІТЫКА ДРУГОЙ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ У 1932—1939 гг. (агляд польскай гістарычнай навуковай літаратуры 1980—1990-х гг.)

**Людміла Дрожжа**

Польская знешняя палітыка перыяду 30-х гг. прайшла пад знакам міралюбства і актыўнага эканамічнага і палітычнага супрацоўніцтва з еўрапейскімі дзяржавамі, а таксама падтрымання палітыкі калектыўнай бяспекі, абвешчанай Лігай Нацый у адпаведнасці з пунктамі 203—210 Версальскага трактата аб раззбраенні. 27 жніўня 1928 г. у Парыжы быў падпісаны пакт Брыана-Келага паміж Англіяй, Францыяй, Бельгіяй, Італіяй, Японіяй, Германіяй, Польшчай і Чэхаславакіяй. З удзелам СССР быў падпісаны другі дагавор, так званы "пакт Ліцвінава", паміж СССР, Эстоніяй, Латвіяй, Польшчай і Румыніяй. 15 студзеня 1931 г. у Жэневе быў заключаны польска-румынскі дагавор тэрмінам на 5 гадоў аб ненападзенні і эканамічным супрацоўніцтве (будаўніцтве мастоў праз рэкі Днестр і Дунай). У 1932 г. Польшча падпісала дагаворы аб ненападзенні з трыма прыбалтыйскімі дзяржавамі. Складанымі заставаліся адносіны з Літвой, галоўным чынам з-за спрэчных прыгранічных пытанняў, і з Чэхаславакіяй, прэзідэнт якой папракаў польскае кіраўніцтва ў нежаданні пайсці на ўступкі Германіі ў рашэнні праблемы "польскага калідора" і падтрымання міру ў Еўропе.

Перастаноўкі ў знешнепалітычным ведамстве Польшчы — прызначэнне ў 1932 г. маладога, але дастаткова вопытнага дыпламата Юзэфа Бэка міністрам замежных спраў — адбіліся на яе міжнароднай палітыцы. Вельмі важнай з'яўляецца ідэалогія ў яго спосабе мыслення. Юзэф Бэк прытрымліваўся традыцыйных парламенцкіх метадаў дэмакратыі, не быў прыхільнікам дзяржаў з таталітарнымі формамі кіравання і быў ярым ворагам камунізму. Вынікам яго ідэалогіі былі адносіны Польшчы з фашысцкай Германіяй і Італіяй, а таксама з СССР, Францыяй і Чэхаславакіяй.

Асноўнымі момантамі гэтай палітыкі з'яўляліся:

— падтрыманне саюзу з Францыяй (Лакарнская дамова 1925 г.) па палажэнню аб мяжы з Румыніяй;

— трывалая пазіцыя ў адносінах да Гданьска ў выпадку рэвізіі немцамі мяжы з Польшчай;

— сяброўскія адносіны з двума вялікімі суседзямі: Германіяй — на захадзе, СССР — на ўсходзе;

— зацікаўленасць у добрасуседскіх адносінах з вялікімі еўрапейскімі дзяржавамі Вялікабрытаніяй і Італіяй;

— дружалюбныя адносіны з Венгрыяй, а таксама з усходнебалтыйскімі дзяржавамі, у тым ліку і з Літвой пасля вырашэння пытання аб Вільні;

— недавер да Чэхаславакіі (галоўным чынам толькі ў адносінах да чэхаў), зацікаўленасць у лёсе Аўстрыі;

— асцярожныя, стрыманыя адносіны да канцэпцыі палітыкі калектыўнай бяспекі ў Лізе Нацый (Цыт. па: Batowski, 1991, s. 17).

Аўтар артыкула прапануе на падставе аналізу навуковых прац польскіх гісторыкаў па праблемах знешняй палітыкі II Рэчы Паспалітай у 1932—1939 гг., якія былі выдадзены за апошнія 15 гадоў, умоўна падзяліць іх на тры навукова-гістарычныя школы:

1. Даследаванні вучоных Польскай акадэміі навук (Інстытута гісторыі і інш.), а таксама Варшаўскага універсітэта (усебаковы аналіз міжнародных адносін Польшчы з суседнімі дзяржавамі ў 1930-я гг.).

2. Працы вучоных Заходняга Пазнанскага інстытута, універсітэта імя А. Міцкевіча, а таксама навуковых цэнтраў Вроцлава, Лодзі, Шчэцына (вывучаюць розныя аспекты міжнародных адносін, у тым ліку і міжнацыянальных, паміж Германіяй і Польшчай, Польшчай і СССР, краінамі Паўднёва-Усходняй Еўропы і інш.).

3. Працы вучоных Ягелонскага (Кракаўскага) універсітэта па знешняй палітыцы Польшчы ў перадваенны перыяд (1938—1939 гг.).

Значную частку бібліяграфіі вывучаемага перыяду складаюць манаграфіі, публіцыстыка, а таксама мемуары польскіх аўтараў, выдадзеныя за мяжой (у Англіі, ЗША і Францыі).

З крыніцазнаўчых матэрыялаў па дадзенай праблематыцы трэба адзначыць зборнік польскіх дыпламатычных дакументаў, прысвечаных Мюнхенскаму дагавору 1938 г., пад рэдакцыяй выдатных гісторыкаў Збігнева Ландау і Іржы Тамашэўскага, дзе быў дадзены кароткі аналіз польскай гістарыяграфіі (Landau, Tomaszewski, 1985). У 1989 г. быў выдадзены першы том "Дакументаў знешняй палітыкі Польшчы ў 1918—1939 гг.", які ўключаў тэксты асноўных міжнародных актаў, заключаных краінай да 1932 г. (Dokumenty z dziejów polskej polityki zagranicznej 1918—1939, t. 1, 1918—1932). Гісторыі дыпламатычных адносін паміж Польшчай і СССР у 1918 — 1943 гг. прысвечаны зборнік дакументаў, надрукаваны ў Варшаве доктарам Ю. Куманецкім (Kumaniecki, 1991). У 1979 г. у гістарычным часопісе універсітэта імя А. Міцкевіча "Studia Historica Slavo-Germanica", т. VIII, быў надрукаваны артыкул Ю. Казенскага "Мюнхенскі дагавор 1938 г. у гістарыяграфіі" (1950—1970-х гг., у т. л. і польскай) (Kozeński, 1979, s. 164—179).

Асноўнай вартасцю прац, выдадзеных у канцы 1980-х—пачатку 1990-х гг., якія адлюстроўваюць шматвектарнасць знешняй палітыкі II Рэчы Паспалітай у 1930-я гг., з'яўляецца адсутнасць ідэалагічнай накіраванасці і гістарычная аб'ектыўнасць.

Сярод манаграфій вядучых гісторыкаў-міжнароднікаў Інстытута гісторыі ПАН неабходна вызначыць калектыўную працу дактароў гісторыі, габілітантаў Марэка К. Камінскага і Міхала І. Захарыяса "У цэню небяспекі. Знешняя палітыка Рэчы Паспалітай у 1918—1939 гг." (Kamiński, Zacharias, 1993). Безумоўным укладам у польскую гістарыяграфію з'яўляюцца калектыўная праца вучоных Варшаўскага універсітэта пад рэдакцыяй рэктара гістарычнага факультэта прафесара А. Гарліцкага "З гісторыі Другой Рэчы Паспалітай" (Z dziejow Drugiej Rzeczypospolitej. Praca zbior. pod red. Garlickiego, 1986) і фундаментальнае даследаванне "Гісторыя Польшчы". Т. 4, ч. 3 (1926—1936); ч. 4 (1936—1939) (Historia Polski, T. 4, cz. III; cz. IV, 1978). Сярод манаграфій, выдадзеных у 1980—1990-я гг., трэба адзначыць працы А. Гарліцкага (Garlicki, 1989), П. Вечаркевіча (Wieczorkiewicz, 1982), П. Ласоўскага

Дрожжа Людміла Чэславаўна — навуковы супрацоўнік Аналітычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі

(Łossowski, 1985; 1990; 1992), С. Лапатнюка (Łopatniuk, 1987), Ю. Лояка і Л. Яржэўскага (Łojek, Jerzewski, 1990), Ю. Красускага (Krasuski, 1985), В. Кавальскага (Kowalski, 1989; Kowalski, Skrzypek, 1980), Ю. Карскага (Karski, 1992), К. Грунберга і Ю. Сержыка (Grünberg, Serczyk, 1990), М. Новак-Келбікавай (Nowak-Kiełbikowa, 1989), М. Нурэка (Nurek, 1983), С. Мікаса (Mikos, 1972), А. Скжыпэка (Skrzypek, 1992), М. Захарыяса (Zacharias, 1981; 1988; 1991; 1992), С. Грэгаровіча, М. Захарыяса (Gregorowicz, Zacharias, 1995), Я. Слюсарчыка (Slusarczyk, 1996) і іншых, якія ўсебакова і на багатым дакументальным матэрыяле адлюстроўваюць асноўныя напрамкі знешняй палітыкі Польшчы ў 1932—1939 гг., яе ўзаемаадносіны з вялікімі суседзямі на ўсходзе і захадзе — СССР і Германіяй, прыгранічныя праблемы з Літвой і Чэхаславакіяй, супярэчлівасць і неадназначнасць адносін з Англіяй і Францыяй, дзейнасць у Лізе Нацый па падтрымцы палітыкі калектыўнай бяспекі ў Еўропе, ролю ў падрыхтоўцы Усходняга пакта. Цікавым з'яўляецца пункт гледжання польскіх гісторыкаў на пакт Рыбентропа-Молатава (23 жніўня 1939 г.) і далучэнне тэрыторый Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны да СССР пасля 17 верасня 1939 г.

Сярод прац, выдадзеных вучонымі Заходняга Пазнанскага інстытута і універсітэта ім. А. Міцкевіча, трэба адзначыць калектыўную манаграфію пад рэдакцыяй прафесара А. Чубінскага, якая раскрывае цэлы этап у вырашэнні спрэчных прыгранічных пытанняў Польшчы з суседнімі краінамі ў 1918—1990 гг. (Problem granic i obszaru odrodzonego państwa polskiego 1918—1990, 1990), а таксама манаграфію Г. Зялінскага "Гісторыя Польшчы. 1914—1939" (Zieliński, 1985). Безумоўны інтарэс для даследчыкаў уяўляюць працы вядомага пазнанскага гісторыка-міжнародніка прафесара М. Вайцэхоўскага, прысвечаныя розным напрамкам польска-нямецкіх стасункаў у 1930-я гг. (Wojciechowski, 1980), кніга яго калегі Мар'яна Мрочкі аб вытоках польскай заходняй ідэі з канца XIX ст. і да пачатку Другой сусветнай вайны (Mroczko, 1986), манаграфія С. Лучака аб сацыяльна-эканамічных адносінах паміж Польшчай і Германіяй з канца XIX ст. і да пачатку 1930-х гг. (Łuczak, 1988), праца Г. Чымека, якая раскрывае закулісную палітыку Сталіна ў адносінах да польскіх камуністаў і членаў ППС в 1918—1939 гг. (Cimek, 1990), а таксама калектыўная манаграфія пад рэдакцыяй доктара гісторыі Ю. Паеўскага, прысвечаная міжнароднай дзейнасці дыпламатычнага корпуса II Рэчы Паспалітай (Ministrowie spraw zagranycznych II Rzeczypospolitej, 1992). Цікавай для ваенных гісторыкаў з'яўляецца манаграфія дацэнта Беластоцкага філіяла Варшаўскага універсітэта М. Лечыка (Leczyk, 1997), прысвечаная міжнародным адносінам Польшчы з еўрапейскімі краінамі ў вайсковых справах 1920—1930-х гг., а таксама дзейнасці Міжсаюзнага камітэта кантроля за раззбраеннем Германіі.

Акрамя гэтага трэба ўлічыць навуковыя працы, выдадзеныя ў канцы 1980-х—1990-я гг. у Гданьскім, Вроцлаўскім, Лодзінскім, Альштынскім навуковых цэнтрах: П. Зарембы (Zaremba, 1991), Б. Лычко-Градзіцкай (Łyczko-Grodzicka, 1981), У. Міховіча (Michowicz, 1986), С. Грэгаровіча (Gregorowicz, 1982), Ю. Гадлеўскага (Godlewski, 1982), Г. Яцкевіча (Jackiewicz, 1980).

Сярод даследаванняў вучоных Ягелонскага (Кракаўскага) універсітэта неабходна адзначыць манаграфіі прафесароў М. Згорняка (Zgórniak, 1993) і Г. Батоўскага (Batowski, 1973; 1991; 1995), прысвечаныя гісторыі дыпламатычнай дзейнасці II Рэчы Паспалітай міжваеннага перыяду, перадваеннай агоніі жніўня—верасня 1939 г., а таксама выдадзеная ў апошнія гады кніга доктара гісторыі А. Л. Совы "На парозе вайны" (Sowa, 1997). У 1984 г. у Кракаве выйшаў з друку аднатомнік "Polska Niepodległa, 1918—1939". Будуць карыстацца попытам сярод даследчыкаў польска-славацкіх адносін працы славацкага гісторыка Е. Орлафай (Orlofa, 1977; 1980; 1984). Значны ўклад у вывучэнне міжнародных адносін Польшчы ў 1930-я гг. унеслі гісторыкі Ягелонскага універсітэта, дзякуючы праведзеным у 1980-я гг. міжнародным канферэнцыям, прысвечаным анексіі Аўстрыі і Мюнхенскай дамове ў 1938 г., а таксама 50-годдзю пачатку Другой сусветнай вайны, матэрыялы якіх былі выдадзены асобнымі зборнікамі (Rok 1938: Aneksja Austrii i Monachium, 1987; Polska, Niemcy, Europa w 1939 r., 1991).

З эміграцкай літаратуры, асвятляючай геапалітычнае становішча Польшчы ў 1930-я гг., цікавымі з'яўляюцца працы А. Цэнцялы (Cienciała, 1986; 1990), Р. Дэнбіцкага (Dębicki, 1962), В. Енджыевіча (Jędrzejewicz, 1984), Ю. Карскага (Karski, 1985), Т. Пішчкоўскага (Piszczkowski, 1975), У. Побаг-Маліноўскага (Póbog-Malinowski, 1956), А. Палонскага (Polonsky, 1972), А. Празмоўскай (Prazmowska, 1987), П. Райны (Raina, 1975), К. Лішэўскага і Р. Шаўлоўскага (Liszewski, Szawłowski, 1986), П. Вандыча (Wandycz, 1976; 1980; 1986; 1988), П. Зарэмбы (Zaremba, 1981), а таксама выдадзеныя ў Польшчы і за мяжой дыпламатычныя дакументы і мемуары аб вядомых палітычных дзеячах II Рэчы Паспалітай (Wapiński, 1988; Terlecki, 1985; Lipski, 1968; Łukasiewicz, 1970; Dyplomata w Paryżu 1936—1939, 1989; Polska polityka zagraniczna w latach 1926—1939, 1990; Beck. Ostatni raport, 1987; Dmowski, 1988; Kasparek, 1992; Kwiatkowski, 1988; 1990; Meysztowicz, 1984; Schimitzek, 1976; Starzeński, 1991; Wodzicki, 1972) і інш.

Канец 1970-х—1980-я гг. з'явіліся складанымі і нестабільнымі ў палітычным і эканамічным становішчы Польшчы. Дзесяцігоддзе ваеннай дыктатуры і сацыяльна-эканамічны крызіс дрэнна паўплывалі на навуковую інтэлігенцыю, асабліва на працы па міжнародных адносінах і знешняй палітыцы, бо яны падвяргаліся цэнзуры. Акрамя гэтага ўсе даследаванні павінны былі адпавядаць афіцыйнай ідэалогіі дзяржавы. Таму ў навуковым асяроддзі атрымаўся своеасаблівы вакуум, які польскія акадэмічныя і універсітэцкія вучоныя актыўна запаўнялі ўдзелам у міжнародных канферэнцыях, прысвечаных ганаровым датам, якія арганізоўваліся і праводзіліся сумесна з нямецкімі калегамі Ягелонскім універсітэтам (да 50-годдзя пачатку Другой сусветнай вайны (1989) і юбілею Мюнхенскай дамовы і анексіі Аўстрыі (1988). Матэрыялы дакладаў канферэнцый былі выдадзены асобнымі часопісамі.

Значную цікавасць для даследчыкаў польскай гістарыяграфіі 1980-х гг. уяўляе манаграфія прафесара Заходняга Пазнанскага інстытута Мар'яна Вайцэхоўскага "Польска-нямецкія стасункі (1933—1938)" (Wojciechowski, 1980). Гісторык разглядае і аналізуе два этапы ў адносінах дзвюх краін: 1934—1935 гг. — перыяд польска-германскага супрацоўніцтва на ўзаемавыгаднай аснове, 1936—1939 гг. — Польшчы адводзіцца роля "сатэліта", паслухмянага выканальніка ролі свайго партнёра па палітычных справах.

Падпісанне 26 студзеня 1934 г. пакта аб ненападзенні аўтар разглядае як вынік пераарыентацыі

тактычнага курсу Веймарскай рэспублікі "з праціўніка Польшчы да яе саюзніка ў справах Германіі" (Wojciechowski, 1980, s. 15). Гітлер планаваў, што Польшча займе ролю ваеннага саюзніка ў выпадку паходу Германіі на СССР. У прыватнай размове з польскім паслом Ліпскім фюрэр выказаўся ў адносінах да бальшавікоў як "галоўнага ворага, якого неабходна знішчыць. Расія — гэта патэнцыяльны вораг Еўропы і еўрапейскай цывілізацыі, а Польшча, як бастыён паміж заходняй цывілізацыяй і Расіяй, можа адыграць значную ролю" (1934, AMSZ, P. III, N 47, 48). Для Польшчы галоўным пытаннем у гэтай дамове было прызнанне Германіяй яе тэрытарыяльнага status quo, а таксама статуса вольнага горада Гданьска і "польскага калідора". Польскі гісторык-эмігрант П. Райна ў кнізе "Польска-нямецкія стасункі ў 1937—1939 гг. (Пэўны характар замежнай палітыкі Юзэфа Бэка)" разглядае дагавор 1934 г. як тактычны ход Гітлера, нейкую "перадышку для ўзбраення Германіі і вырашэння ўсіх спрэчных пытанняў з пазіцыі сілы" (Raina, 1975, s. 16). Гэты дакумент таксама негатыўна адбіўся на адносінах Чэхаславакіі і СССР з Польшчай, паколькі Чэхаславакія магла быць падвергнута нямецка-вянгерска-польскай агрэсіі. Рост антысавецкай істэрыі ў Польшчы таксама негатыўна адбіўся на савецка-польскіх адносінах, якімі Сталін быў вельмі занепакоены.

М. Вайцэхоўскі адзначае, што перыяд польска-нямецкага супрацоўніцтва ў 1934—1935 гг. дапамог Германіі пазбегнуць удзелу ў англа-французскай дамове па падтрыманню сістэмы калектыўнай бяспекі ў Еўропе, а таксама ўзброіцца. Аўтар падрабязна аналізуе адносіны Англіі, Францыі і СССР да польска-германскага супрацоўніцтва на еўрапейскай арэне. Гэтыя краіны, кожная паасобку, былі зацікаўлены ў тым, каб скасаваць польска-германскі дагавор. Асаблівыя намаганні ў гэтым праявіла брытанская дыпламатыя, бо саюз дзвюх суседніх дзяржаў не даваў ёй магчымасці нейтралізаваць Германію як сур'ёзнага саперніка ў Еўропе. Сама ж Польшча імкнулася адцягнуць увагу Германіі ад саюза з еўрапейскімі краінамі (падпісання антысавецкага "пакта чатырох" паміж Англіяй, Францыяй, Германіяй і Італіяй 15 ліпеня 1933 г. у Рыме, які не быў ратыфікаваны з-за шматлікіх супярэчнасцяў паміж удзельнікамі) шляхам тактыкі "прэвентыўнай вайны", якую не збіралася, да і не магла праводзіць (Wojciechowski, 1980, s. 126).

У другой фазе палітычнага супрацоўніцтва Варшава ўжо не з'яўлялася адзіным партнёрам Берліна. На першае месца выходзіць фашысцкая Італія, а Польшчы надаецца роля "сатэліта", паслухмянага выканальніка волі свайго партнёра па палітычных справах. Гітлер бачыў магчымасць дваяка выкарыстаць Польшчу ў будучым: "як саюзніка ў сумесным паходзе на СССР альбо "абарончага валу", калі б немцы спачатку вырашылі сілай расправіцца з заходнімі дзяржавамі" (Wojciechowski, 1980, s. 376). Таму з 1936 г. (з рэмілітарызацыі Рэйнскай зоны) Германія праводзіць палітыку падпарадкавання Польшчы сваім інтарэсам. Гэта палітыка праявілася ў нарастаючым даўленні па пытанню аб статусе вольнага горада Гданьска і Памор'я (5 лістапада 1937 г. паміж міністрамі замежных спраў фон Мольткэ і Бэкам была падпісана нямецка-польская дэкларацыя, у якой падкрэслівалася, што "яна з'яўляецца актам добрай волі і добрасуседскіх адносін у вырашэнні ўсіх спрэчных пытанняў паміж краінамі") (Documents of Germen Foreign Policy (1937—1945), 1949—1966. Series D, vol. V, N 18; Polish White Book (1933—1939), 1940, N 32), будаўніцтве аўтастрады і чыгуначнай магістралі ва Усходнюю Прусію праз памеранскі "калідор", а таксама ў ізаляцыі Польшчы ад заходніх краін па пытанню аб заключэнні Заходняга пакта аб калектыўнай бяспецы ў Еўропе (у айчыннай гістарыяграфіі — Усходняга пакта).

У перыяд паміж аншлюсам Аўстрыі і Мюнхенскай дамовай Германіі зноў спатрэбілася падтрымка Польшчы. Апошняя, на думку аўтара, мела свой інтарэс у гэтым супрацоўніцтве. Дзякуючы палітыцы "лавіравання" паміж Германіяй і заходнімі партнёрамі, Юзэф Бэк намерваўся падстрахаваць Польшчу ў захаванні тэрытарыяльнага status quo з немцамі, а таксама агульнай вянгерска-польскай граніцы (Wojciechowski, 1980, s. 540). Такім чынам Польшча імкнулася стварыць фронт, які з аднаго боку перашкаджаў бы пранікненню Германіі ў Цэнтральна-Усходнюю Еўропу, з другога — блакіраваў бы СССР. Нельга пагадзіцца з аўтарам на конт таго, што палякі "рашуча супраціўляліся" падзелу Чэхаславакіі і ліквідацыі яе дзяржаўнасці. Міністр замежных спраў Польшчы Ю. Бэк неаднаразова падкрэсліваў у сваіх дыпламатычных прамовах, што Чэхаславакія — "гэта краіна, якая самастойна не можа вырашыць свае праблемы", да таго ж ён адчуваў моцную асабістую непрыемнасць да чэхаславацкага прэм'ер-міністра Ю. Бэнэша (Beck, 1987, s. 40). Акрамя гэтага Польшча была вельмі зацікаўлена ў вырашэнні пытання аб далучэнні Цешынскай вобласці Чэхаславакіі, населенай палякамі, пасля плебісцыту аб яе аўтаноміі, дзякуючы "нейтралітэту" свайго суседа Германіі.

Паміж аншлюсам Аўстрыі ў сакавіку 1938 г. і Мюнхенскім дагаворам 29—30 верасня і ўводам германскіх войск у Судзецкую вобласць Чэхаславакіі прайшло каля паўгода. За гэты перыяд еўрапейскія дзяржавы (Англія, Францыя, Германія, Польшча, Чэхаславакія, СССР), хто "відавочна, а хто таемна рыхтаваўся да палітычных змен у Еўропе, перадзелу граніц за кошт суседніх дзяржаў, не выключая таксама магчымасці ваеннай экспансіі" (Kowalszyk, 1976, s. 47).

Пасля падпісання 6 лістапада 1937 г. антыкамінтэрнаўскага пакта паміж Германіяй, Японіяй і Італіяй, далучэння Гданьска да Германіі, Мюнхенскай дамовы і здачы Чэхаславакіі немцам стан Польшчы, як краіны-сатэліта, значна пагоршыўся. У выніку захопніцкай палітыкі "Трэцяга рэйха", якая ліквідавала тэрытарыяльна-палітычную сістэму, гарантаваную Версальскім дагаворам, Ю. Бэк, праводзячы палітыку "лавіравання" паміж еўрапейскімі дзяржавамі, Германіяй і СССР, здрадзіў нацыянальным інтарэсам Польшчы, падтрымлівая "добрасуседскі нейтралітэт". Аднак палякі застрахавалі сябе перад умяшаннем Германіі ў пытанне па стану нацыянальнай нямецкай меншасці і дабіліся ад яе прызнання польска-французскага дагавора аб супрацоўніцтве.

Праца навуковага супрацоўніка Пазнанскага Заходняга інстытута доктара Мар'яна Мрочкі "Польская заходняя ідэя (1918—1939)" (Mroczko, 1986) раскрывае гістарычную рэтраспектыву становішча польскіх заходніх зямель з канца XIX ст. і да пачатку Другой сусветнай вайны. Аўтар манаграфіі падрабязна аналізуе вытокі польскай заходняй ідэі, агульныя абрысы заходняй мяжы Рэчы Паспалітай пасля апошняга падзелу ў 1795 г., яе становішча пасля ўваходу ў Расійскую імперыю і да пачатку Першай сусветнай вайны. Асобныя главы прысвечаны тэрытарыяльнаму status quo

Польшчы пасля Версальскай дамовы і дагавора ў Лакарна. Тры апошнія главы разглядаюць пытанні аб заходняй мяжы паміж Польшчай і Германіяй пасля падпісання дэкларацыі 1934 г. (дзейнасць Памеранскага, Пазнанскага, Сілезскага цэнтраў па прапагандзе праблемы заходніх граніц), вынікі Мюнхенскай дамовы і стан польскай меншасці на тэрыторыі Усходняй Прусіі, а таксама апошні год перад фашысцкай агрэсіяй і пачаткам Другой сусветнай вайны. Асноўная мэта аўтара даследавання — паказаць эвалюцыйнае развіццё ідэі аб заходніх граніцах Польшчы. Вядомы польскі дыпламат і грамадскі дзеяч Раман Дмоўскі адзначаў, што "тэрыторыя ад вусця р. Эльбы да Одэра (Горны Зляск, Пазнанскі край і Гданьскае Памор'е) лічыцца краем славянскім, галоўным чынам, польскім. Польшча бяз Гданьска і Кролеўца (Кенігзберга) не Польшча" (Dmowski, 1908, s. 24—27).

М. Мрочка змяшчае грунтоўную бібліяграфію польскіх даследчыкаў па праблеме прыгранічных польска-германскіх стасункаў, выдадзеную ў 60—70-я гг. Гэта працы У. Вржэзінскага (Wrzesiński, 1975, s. 67—118), Г. Зялінскага (Zieliński, 1969, s. 407—423), М. Аржэхоўскага (Orzechowski, 1975, s. 13—37), А. Квілецкага (Kwilecki, 1980, s. 5—21), А. Чубінскага (Czubiński, 1980, s. 63—127), Г. Лабуды (Labuda, 1971), Ю. Паеўскага (Pajewski, 1978), Ю. Красускага (Krasuski, 1967; 1963, s. 553—630; 1977, s. 177—216), Р. Вапінскага (Wapiński, 1966; 1977, s. 531—543; 1969, s. 47—62; 1983), У. Дрэўняка (Drewniak, 1980, s. 41—51), Ю. Зарноўскага (Żarnowski, 1958, s. 714—737), Ю. Холзэра (Holzer, 1974).

Дзейнасці выдатнага палітычнага дзеяча Польшчы першай трэці XX ст. Юзэфа Пілсудскага, барацьбіта за вышэйшыя нацыянальныя інтарэсы — аднаўленне Рэчы Паспалітай у яе гістарычных межах да падзелу ў 1772 г., які забяспечыў яе дзяржаўны суверэнітэт у лістападзе 1918 г., прысвечана манаграфія прафесара А. Гарліцкага (Garlicki, 1989). Аўтар падрабязна разглядае рэвалюцыйны шлях Ю. Пілсудскага, палітычныя рэпрэсіі з боку царскага ўрада, далейшую актыўную дзейнасць у Польскай Сацыялістычнай партыі (ППС) на пачатку XX ст. Выказваючы інтарэсы шляхецка-інтэлігенцкай часткі польскага насельніцтва, Пілсудскі падкрэсліваў, што адзінымі саюзнікамі польскага пралетарыяту ў барацьбе за нацыянальнае вызваленне з'яўляюцца тыя прыгнечаныя царызмам народы, якія некалі ўваходзілі ў склад Рэчы Паспалітай (Garlicki, 1989, s. 41). У гады Першай сусветнай вайны і польска-савецкай вайны 1919—1920 гг. ён паказаў сябе як таленавіты палкаводзец. Да Рыжскага дагавора 1921 г. ён аднёсся як да вымушанага і часовага акта. Пасля прыняцця ў 1921 г. першай пасляваеннай польскай канстытуцыі ў краіне пачаў дзейнічаць двухпалатны парламент (сейм і сенат), усе грамадзяне былі абвешчаны роўнымі перад законам. Але на практыцы сацыяльныя правы працоўных не захоўваліся. Стан нацыянальных меншасцяў, якія складалі больш за 30 % ад агульнага насельніцтва Польшчы, заставаўся вельмі цяжкім. У сельскай гаспадарцы захоўвалася памешчыцкае землеўладанне, агульны памер прамысловай вытворчасці знізіўся да ўзроўню 1913 г. Вастрыня сацыяльных і нацыянальных супярэчнасцяў, напружанае міжнароднае становішча Польшчы пасля падпісання Лакарнскага дагавора 1925 г. з Францыяй аб ненападзенні, які не гарантаваў бяспекі яе заходніх граніц, былі выкарыстаны прыхільнікамі Пілсудскага для дзяржаўнага перавароту. 12—14 мая 1926 г. у Польшчы быў усталяваны "санацыйны" рэжым. Прэзідэнтам краіны быў вызначаны І. Масціцкі, прэм'ер-міністрам і міністрам абароны — Ю. Пілсудскі.

Дзейнасць Пілсудскага пасля перавароту 1926 г. была накіравана на тое, каб "пераканаць маёмасныя класы, што ім не толькі нічога не пагражае з боку новай кіруючай каманды, але наадварот — яна сапраўды найбольш эфектыўна забяспечыць іхнія інтарэсы" (Garlicki, 1989, s. 411).

Сітуацыя, якая склалася ў краіне, была незвычайнай: існавала дыктатура ў асобе прэм'ер-міністра Ю. Пілсудскага пры захаванні структур парламенцкай дэмакратыі (Garlicki, 1989, s. 473). Увогуле новы польскі лідэр, як адзначае аўтар, быў празарлівым і хітрым палітыкам. Каб здзейсніць свае намеры па аднаўленню Рэчы Паспалітай у межах да 1772 г., ён распрацаваў доўгатэрміновую канцэпцыю яе знешняй палітыкі, асноўнымі напрамкамі якой былі добрасуседскія адносіны з краінамі як на захадзе, так і на ўсходзе. У выніку свайго міралюбівага знешнепалітычнага курсу Польшча ўступіла ў Лігу Нацый і была прынята ў якасці пастаяннага прадстаўніка ў верасні 1926 г., адразу пасля Германіі (8 верасня 1926 г.). Такім чынам, падкрэслівае аўтар, Польшча магла праводзіць палітыку modus vivendi з двума вялікімі суседзямі — Германіяй і Савецкім Саюзам, что ў значнай ступені гарантавала ёй трывалае становішча ў еўрапейскай перадваеннай палітыцы.

Першыя дэмакратычныя за пасляваенныя гады выбары польскага сейма 4 чэрвеня 1989 г. карэнным чынам змянілі палітычнае і сацыяльна-эканамічнае становішча Польшчы. Крах таталітарнай савецкай сістэмы і посткамуністычнае развіццё краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы далі магчымасць самастойнага і незалежнага развіцця шматмільённаму насельніцтву кантынента. Палітыка дэмакратызацыі грамадскага жыцця, плюралізму поглядаў і адкрытасці пазітыўна паўплывала на стан развіцця грамадскіх навук. Акрамя таго, былі пазнімаvы сакрэтныя грыфы з архіўных дакументаў, якія пралілі святло на рэальныя факты са шматлікіх міжнародных дагавораў Польшчы з еўрапейскімі краінамі, ратыфікаваных у 1930-я гг.

Першай працай "новага часу" можна лічыць манаграфію вядучых навуковых супрацоўнікаў Інстытута гісторыі ПАН дактароў гісторыі М. К. Камінскага і М.І. Захарыяса "У ценю небяспекі. Знешняя палітыка Рэчы Паспалітай у 1918—1939 гг.", выдадзеную ў 1993 г. у Варшаве. Ва ўступе М. Камінскі адзначае, што кніга надрукавана пад уплывам ідэалагічных змен, якія адбыліся ў краіне пасля 1989 г. Аўтар падкрэслівае, што ў Польшчы недастаткова глыбока і поўна прадстаўлена і вывучана замежная гістарыяграфія знешняй палітыкі II Рэчы Паспалітай. У першых трох главах падрабязна разглядаюцца спрэчныя прыгранічныя пытанні з Германіяй, СССР, Чэхаславакіяй, Венгрыяй, Літвой у 1920-я гг. Аб'ектыўная палітычная ацэнка дадзена Рыжскаму мірнаму дагавору, а таксама дыпламатычнай і грамадскай дзейнасці нацыянальнага польскага дзеяча Ю. Пілсудскага ў яго намаганнях па аднаўленню краіны ў межах да 1772 г. Асобныя раздзелы прысвечаны ўтварэнню Лігі Нацый, спецыяльнай міжнароднай арганізацыі па мірнаму рэгуляванню ўсіх спрэчных пытанняў паміж краінамі свету, Рапальскаму і Лакарнскаму дагаворам. Трэцяя і чацвёртая главы кнігі, якія напісаны доктарам М. Захарыясам, асвятляюць

"палітыку раўнавагі" польскага кіраўніцтва ў адносінах да Германіі і Савецкага Саюза. У выніку палітычнага перавароту 12—14 мая 1926 г. да дзяржаўнай улады прыйшлі паплечнікі Пілсудскага, а ён быў вызначаны прэм'ер-міністрам і вярхоўным галоўнакамандуючым. Новы польскі лідэр прапанаваў канцэпцыю знешняй палітыкі краіны, якая асноўвалася на "міралюбстве, пераемнасці традыцый, адзінстве і маналітнасці" (Kamiński, Zacharias, 1993, s. 93). Падчас дыпламатычных перамоў з савецкім пасломП. Войкавым Пілсудскі зрабіў акцэнт на тым, што ў яго няма ніякага жадання размаўляць са сваімі вялікімі суседзямі на ўсходзе і захадзе з пазіцыі "ваеннай сілы". "Які інтарэс увогуле Польшча можа мець ў вайне? Для яе зараз галоўнае — аднаўленне эканомікі, сацыяльнага і культурнага жыцця краіны. Няма ў яе жадання рэвізіі граніц з Расіяй таксама, як і зацікаўленасці ў змене камуністычнага рэжыму" (Kamiński, Zacharias, 1993, s. 92).

Польская дыпламатыя ў адпаведнасці з міралюбівай знешнепалітычнай лініяй Лігі Нацый падтрымлівала палітыку калектыўнай бяспекі ў Еўропе. Але ж асноўную ролю ў яе рэалізацыі, а таксама ў кантролі над Германіяй узялі на сябе Англія і Францыя. Польшчы там не было месца.

Да пачатку 1930 г. значна пагоршыліся адносіны паміж Польшчай і Германіяй з-за іх усходняга суседа Чэхаславакіі. Памылка Пілсудскага была ў тым, што з 1926 па 1932 г. ён не прымаў ніякіх канкрэтных захадаў у набліжэнні да яе. Пасля візіту польскага міністра прамысловасці і эканомікі Квяткоўскага ў Прагу з "добрымі намерамі", ён сустрэў халодную непрыязнасць з боку прэзідэнта Томаша Масарыка. Чэшскі лідэр лічыў галоўнымі парушальнікамі спакою ў Еўропе Венгрыю і "польскі калідор" (лінію Керзона). Да таго ж, на яго думку, Польшча павінна была пайсці на ўступкі ў справе падтрымання міру (Kamiński, Zacharias, 1993, s. 121).

У пятай главе манаграфіі адлюстроўваюцца складаныя і супярэчлівыя палітычныя адносіны паміж Польшчай, СССР, Францыяй і Германіяй у распрацоўцы канцэпцыі Усходняга пакта. Асноўным натхняльнікам і ініцыятарам гэтага дакумента стаў французскі міністр замежных спраў Жан Луі Барту, які заняў пасаду ў лютым 1934 г. З красавіка ён актыўна пачаў прапанаваць СССР удзел у гэтым пакце перад пагрозай рэальнай небяспекі з боку Германіі. У канцы верасня быў распрацаваны праект пакта, які складаўся з трох частак. Першая — трактат аб узаемадапамозе, які павінны былі падпісаць СССР, Польшча, Чэхаславакія, Фінляндыя, Германія, Эстонія, Латвія і Літва. Праект трактата накладаў на яго ўдзельнікаў абавязкі аказваць ваенную дапамогу ў выпадку агрэсіі з боку дзяржавы, што не падпісала пакт. Другая частка — савецка-французскі дагавор, які зыходзіў з вынікаў Лакарнскага дагавора, на тых жа ўмовах, што і з Брытаніяй і Італіяй, і быў бы гарантам франка-германскай граніцы і дэмілітарызаванай Рэйнскай зоны. Трэці элемент пакта — гарантыйны акт, мог уступіць у дзеянне пасля падпісання ўсімі ўдзельнікамі дагавора. Усходні пакт павінен быць ратыфікаваны ўсімі краінамі-удзельніцамі пасля прыняцця СССР у Лігу Нацый.

У выніку візітаў Барту ў Германію і Польшчу па пытанню польска-французскай канвенцыі нямецкі міністр замежных спраў фон Нэйрат выказаў незадаволенасць на конт таго, што аўтары праекта Францыя і СССР прыгнятаюць Германію, якая выступае ў ролі "мячыка" ў іх дыпламатычнай гульні, і не хочуць прытрымлівацца лакарнскай дамоўленасці (Kamiński, Zacharias, 1993, s. 159). У выпадку савецка-японскага канфлікту на Дальнім Усходзе рэалізацыя Усходняга пакта для Германіі стала б сур'ёзным эксцэсам. Да таго ж польскі пасол у Берліне Ліпскі пісаў у сваіх справаздачах, што "Гітлер нам не сімпатычны". Такім чынам Польшча і Германія імкнуліся дасягнуць сваіх мэтаў паасобку. З пункту гледжання М. Захарыяса, Польшча не ўдзельнічала ва Усходнім пакце галоўным чынам з-за рознагалоссяў з Германіяй, якая патрабавала захавання рапальскіх і лакарнскіх дамоўленасцяў. У выніку правала канцэпцыі Усходняга пакта 2 мая 1935 г. у Парыжы быў падпісаны двухбаковы савецка-французскі дагавор аб ненападзенні і ўзаемадапамозе тэрмінам на 10 гадоў.

Дзве апошнія главы кнігі прысвечаны заканчэнню палітыкі невызначанасці ў адносінах паміж Польшчай і "Трэцім рэйхам". Пагаршэнне міжнароднага становішча ў апошнія гады перад пачаткам Другой сусветнай вайны значна абмежавала магчымасці замежнай палітыкі II Рэчы Паспалітай. Мюнхенскі дагавор 29—30 верасня 1938 г. стаў сімвалам палітыкі *appeasementu*. Большасць гісторыкаў лічыць, што "ўміратварэнне, патуранне" агрэсіўнай палітыцы Германіі былі вынікам дзейнасці Нэвіля Чэмберлена, які прыступіў да абавязкаў прэм'ер-міністра Вялікабрытаніі ў маі 1937 г., у яго намаганнях накіраваць экспансію нацыстаў на ўсход, у бок СССР. Брытанскія і французскія дыпламаты вырашылі, што рэгуляваць адносіны паміж Германіяй і Італіяй яны павінны без удзелу СССР і ЗША. Як падкрэсліваў пасол ЗША Тэйлар, іх палітыка нагадвала "эпоху Метэрніха альбо Бісмарка, калі Еўропа заставалася цэнтрам міру" (Kamiński, Zacharias, 1993, s. 205).

Восень 1938 г.—вясна 1939 г. сталі апошнім этапам палітыкі "добрасуседскіх адносін" паміж палякамі і немцамі (Kamiński, Zacharias, 1993, s. 231). Няўдалыя перамовы аб наданні Гданьску статуса свабоднай зоны паставілі апошнюю кропку ў нямецка-польскіх адносінах. Гітлер больш не лічыў Польшчу сваёй саюзніцай. Ён накіраваў свой позірк у бок яе ўсходняга суседа СССР. У выніку сакрэтных перамоў паміж міністрамі замежных спраў "Трэцяга рэйха" і СССР Рыбентропам і Молатавым 23 жніўня 1939 г. быў падпісаны дагавор аб ненападзенні тэрмінам на 10 гадоў. Ён гарантаваў абедзвюм дзяржавам адсутнасць агрэсіўных дзеянняў на агульных тэрыторыях. У выпадку нападзення адной з краін на трэцюю краіну ўдзельнікі дагавора павінны захоўваць нейтралітэт у адносінах адзін да аднаго. У дапаўненне да пакта былі прыняты два тайныя пратаколы, якія вырашылі лёс прыбалтыйскіх краін і Польшчы. Такім чынам, на думку аўтараў кнігі, былыя саюзнікі II Рэчы Паспалітай апынуліся ў стане яе ворагаў. Нападзенне Германіі на Польшчу 1 верасня 1939 г. стала пачаткам новай сусветнай вайны.

Падводзячы вынікі ў ацэнцы дадзенай манаграфіі, трэба падкрэсліць, што яе аўтары ўпершыню ў польскай гістарыяграфіі 1990-х гг. вызначылі і аб'ектыўна прааналізавалі ролю і месца Польшчы ў еўрапейскай міжнароднай палітыцы паміж дзвюма сусветнымі войнамі.

Фундаментальным выданнем па гісторыі вайсковых стасункаў паміж еўрапейскімі краінамі ў перадваенны час з'яўляецца манаграфія прафесара Ягелонскага універсітэта Мар'яна Згорняка "Еўропа ў прадвер'і вайны. Ваенная сітуацыя ў 1938—1939 гг." (Zgórniak,

1993). У ёй аўтар падрабязна разглядае планы ваенных дзеянняў фашысцкіх дзяржаў Германіі і Італіі, ваенна-палітычную сітуацыю ў Еўропе пасля Мюнхенскага дагавора, сакавіцкі крызіс 1939 г. і акупацыю Чэхаславакіі, планы "Трэцяга рэйха" Fall Süd-Ost, Fall West і Fall Ost, палітыка-мілітарысцкае становішча ў рэгіёне Міжземнага мора, вайсковыя прыгатаванні Польшчы да абароны ў 1939 г., а таксама Англіі, Францыі, прыбалтыйскіх краін і СССР у выпадку вайны. Згорняк падкрэслівае, што, нягледзячы на вялікую колькасць літаратуры, прысвечанай Другой сусветнай вайне, значна менш увагі даследчыкі ўдзялілі праблемам дыпламатычных намаганняў еўрапейскіх дзяржаў передваеннага часу па стрымліванню агрэсіўнай палітыкі Германіі. Увогуле кніга складаецца з 16 раздзелаў, аўтар выкарыстаў звыш 660 адзінак бібліяграфіі і каля 200 адзінак архіўных матэрыялаў.

М. Згорняк лічыць, што Еўропа апынулася на парозе новай сусветнай вайны невыпадкова. Вынікам гэтага было не толькі жаданне краін, якія прайгралі ў Першай сусветнай вайне, зноў пачаць перадзел ужо падзеленага міру ў барацьбе за старыя і новыя калоніі, але і выхад на арэну еўрапейскай палітыкі таталітарных фашысцкіх дзяржаў Германіі і Італіі, якія абвясцілі ў якасці жыццёва важных інтарэсаў нацый пашырэнне тэрыторый сваіх краін за кошт бліжэйшых суседзяў. Акрамя гэтага яны праводзілі палітыку генацыду ў адносінах да нацый неарыйскага паходжання (яўрэяў, славян), лічачы іх найменш развітымі і няздольнымі да самастойнага і незалежнага развіцця.

Савецкі Саюз у 1920—1930-я гг. актыўна будаваў сацыялізм у "адзінай, асобна ўзятай краіне", ствараючы айчынную індустрыю і ваенную прамысловасць. Чырвоная Армія па свайму ваенна-тэхнічнаму і каманднаму складу, узроўню падрыхтоўкі да вядзення ваенных дзеянняў была мацней армій еўрапейскіх дзяржаў. Да таго ж СССР прапаведваў тэорыю "сусветнай сацыялістычнай рэвалюцыі" і быў зацікаўлены ў пашырэнні межаў савецкіх рэспублік, аднаўленні ранейшага ўздзеяння расійскай імперыі Раманавых і імперыі Габзбургаў у краінах Цэнтральнай, Усходняй і Паўднёвай Еўропы (Польшчы, Аўстрыі, Венгрыі, Чэхаславакіі, Югаславаіі, Румыніі, а таксама краінах Балтыі) (Zgórniak, 1993, s. 565).

Заходнееўрапейскія дэмакратыі Англія і Францыя перад узмацненнем прапаганды вайны з боку нацыянал-сацыялістаў і камуністаў разлічвалі накіраваць агрэсіўнага саперніка Германію ў бок свайго партнёра Савецкага Саюза, вырашыў дзве праблемы: знішчэнне камуністычнай дзяржавы і нейтралізацыю мілітарысцкіх імкненняў Германіі. Яны разглядалі армію "Трэцяга рэйха" і Чырвоную Армію як найбольш моцныя і баяздольныя ў якасці асноўных элементаў у вайне на заходнім фронце (Zgórniak, 1993, s. 567). Аўтар выказвае меркаванне, ці з'яўляліся ваенныя прыгатаванні СССР у чэхаславацкім крызісе рэальнымі, альбо гэта было толькі дэманстрацыяй сілы. Пасля акупацыі Прагі савецкае кіраўніцтва зразумела, што настаў час для вырашэння праблемы заходняй граніцы з Польшчай без ваенных захопаў. Пасля сакрэтных перамоў паміж Гітлерам і Сталіным, 23 жніўня 1939 г. быў падпісаны савецка-германскі дагавор аб ненападзенні, які нанёс смяротны ўдар Польшчы, а таксама краінам Балтыі, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне, Бесарабіі.

Аўтар канстатуе, што калі б еўрапейскія краіны, пераадолеўшы асабістыя амбіцыі ў жаданні засцерагчыся ад небяспекі перад агрэсіўнымі планамі "Трэцяга рэйха" за кошт свайго суседа, здолелі аб'яднаць свае ўзброеныя сілы (толькі ў СССР да 1939 г. было 56 дывізій), у выніку захопніцкія планы Германіі сталі б нерэальнымі, бо раўнавагі ваеннага патэнцыялу немцы змаглі дасягнуць толькі ў 1944—1945 гг. (Zgórniak, 1993, s. 569). Але гэтага не адбылося. Пасля далучэння Аўстрыі і Чэхаславакіі з іх вялікімі гаспадарчымі і ваеннымі рэсурсамі да 1 верасня 1939 г. Германія ўжо з'яўлялася дастаткова моцнай у ваенных адносінах, каб пачаць вайну. Такім чынам М. Згорняк прыходзіць да высновы, што Другую сусветную вайну было магчыма прадухіліць яшчэ ў 1938 г., не дапусціўшы тых велізарных чалавечых ахвяр і матэрыяльных страт, якія адбыліся ў яе выніку.

Манаграфія "На парозе вайны", надрукаваная ў 1997 г. доктарам гісторыі, дацэнтам Ягелонскага універсітэта Анджэям Совай, прысвечана знешняй і ўнутранай палітыцы ІІ Рэчы Паспалітай перадваеннага часу (Sowa, 1997). Кніга складаецца з чатырох глаў і заканчэння. У першай главе аўтар зрабіў невялікі агляд польскай і замежнай гістарыяграфіі, прысвечанай дадзенай праблематыцы. Другая глава "Дылемы ўнутранай палітыцы" асвятляе пытанні эканамічных цяжкасцей Польшчы ў канцы 1930-х гг., шырока разгорнутай кампаніі ў прэсе па трансфармацыі грамадскай самасвядомасці палякаў пасля Мюнхенскай дамовы ў 1938 г., дзейнасці рымска-каталіцкай царквы перад пагрозай новай вайны і інш. Трэцяя глава "Нацыянальныя меншасці ІІ Рэчы Паспалітай" упершыню ў польскай гістарыяграфіі закранае сацыяльнае, нацыянальнае і эканамічнае становішча беларусаў, украінцаў, літоўцаў, немцаў, яўрэяў і іншых народнасцяў, якія жылі на тэрыторыі Польшчы ў 1920—1930-я гг. Апошняя глава "Дэтэрмінанта міжнароднага становішча ІІ Рэчы Паспалітай" разглядае пытанні альтэрнатыўных канцэпцый міжнароднай палітыкі польскага кіраўніцтва, адносіны з Вялікабрытаніяй і Чэхаславакіяй, вынікі эвентуальнага саюза з "Трэцім рэйхам", складаныя адносіны паміж суседзямі Польшчы Германіяй і СССР, Гітлерам і Сталіным. Асабліва на апошнім пытанні трэба спыніцца больш падрабязна.

У адпаведнасці з міралюбівым знешнепалітычным курсам ІІ Рэчы Паспалітай, які быў распрацаваны на пачатку 1930-х гг. Юзэфам Пілсудскім, яго пераемнік міністр замежных спраў Ю. Бэк праводзіў палітыку "раўнавагі" з абодвума вялікімі суседзямі, добра разумеючы магчымасць канфрантацыі ў адносінах паміж нацыстамі і таталітарным рэжымам Сталіна. Палякі жадалі гарантыйнага захавання і нерухомасці сваіх усходніх і заходніх граніц, таму 25 ліпеня 1932 г. быў падпісаны польска-савецкі пакт аб неагрэсіі, а 26 студзеня 1934 г. дэкларацыя аб узаемадапамозе і супрацоўніцтве з немцамі тэрмінам на 10 гадоў (Sowa, 1997, s. 196). Кіраўнікі Вялікабрытаніі і Францыі з асаблівым абурэннем успрынялі апошні дагавор Польшчы, бо бачылі ў ім ушчамленне сваіх асабістых інтарэсаў у Еўропе. На думку аўтара манаграфіі, брытанскі лідэр У. Чэрчыль памылкова лічыў дагавор "катастрофай у вырашэнні лёсу Чэхаславакіі і Аўстрыі, а таксама перашкодай салідарнасці інтарэсаў краін Усходняй Еўропы" (Sowa, 1997, s. 197). Няўдалай апынулася спроба французскага міністра замежных спраў Луі Барту стварыць вясной 1934 г. саюз (Усходні пакт), які павінен быў гарантаваць захаванне дзяржаўных граніц паміж еўрапейскімі краінамі, з удзелам СССР, Польшчы, Германіі,

Чэхаславакіі і трох прыбалтыйскіх дзяржаў з-за адказу немцаў і палякаў. Але ж у маі 1935 г. СССР, нягледзячы на дагавор з Польшчай, падпісаў савецка-французскую дэкларацыю аб ненападзенні тэрмінам на 10 гадоў (Sowa, 1997, s. 198).

Падводзячы вынікі перыяду польска-савецкага супрацоўніцтва, доктар Сова сцвярждае, што Сталін ніколі не бачыў у Польшчы сур'ёзнага партнёра ў вырашэнні еўрапейскіх спраў (Sowa, 1997, s. 200, 203). Зусім іншым быў яго падыход да Германіі, якой савецкі лідэр давяраў значна больш, чым Вялікабрытаніі.

Пасля падпісання савецка-германскага дагавора ў жніўні 1939 г. і двух тайных пратаколаў канчаткова былі вырашаны лёсы Польшчы, Літвы, Латвіі і Эстоніі. Такім чынам былыя саюзнікі II Рэчы Паспалітай здрадзілі сваім абавязкам у адпаведнасці з папярэднімі дамоўленасцямі. На думку аўтара кнігі, Сталін, як і Гітлер, з'яўляецца вінаватым у нападзенні на Польшчу і развязванні Другой сусветнай вайны (Sowa, 1997, s. 222).

Падводзячы вынікі, неабходна падкрэсліць, што пункты гледжання сучасных польскіх палітолагаў і гісторыкаў на знешнюю палітыку II Рэчы Паспалітай у 1930-я гг. далёка не заўсёды супадаюць, а часам маюць процілеглы характар. Гэта датычыцца двухбаковых адносін паміж Польшчай, Германіяй і СССР, удзелу краіны ў Мюнхенскай дамове, адносін да палітыкі калектыўнай бяспекі ў Еўропе і інш. Так, прафесар Пазнанскага Заходняга інстытута М. Вайцэхоўскі выдзяляе два этапы ў развіцці германа-польскіх адносін, адводзячы апошняй першапачаткова ролю саюзніка, а потым сатэліта ў выкананні захопніцкай палітыкі "Трэцяга рэйха". Гэтага меркавання прытрымліваюцца яго калегі А. Чубінскі і Г. Зялінскі (Czubiński,1990; Zieliński, 1985). Доктар, габілітант М. Захарыяс (Інстытут гісторыі ПАН) лічыць германа-польска-савецкія адносіны ўвасабленнем палітыкі "раўнавагі" кіруючага кола II Рэчы Паспалітай да сваіх суседзяў на ўсходзе і захадзе (Kamiński, Zacharias, 1993; Gregorowicz, Zacharias, 1995). Прадстаўнік гістарычнай школы Ягелонскага універсітэта прафесар М. Згорняк дае негатыўную ацэнку палітыцы лавіравання польскага ўрада ў вырашэнні чэшскага крызісу, болей таго, ён лічыць Мюнхенскі зговар асноўнай прычынай на шляху да развязвання Другой сусветнай вайны (Zgórniak, 1993). Больш станоўчую ацэнку мюнхенскім падзеям даюць варшаўскія гісторыкі М. Захарыяс, П. Ласоўскі, П. Вечаркевіч (Kamiński, Zacharias, 1993; Łossowski, 1992; Wieczorkiewicz, 1982), калі робяць акцэнт на вырашэнні лёсу цешынскіх палякаў. Яны пагаджаюцца з трактоўкай гэтых падзей заходнімі палітолагамі як палітыкі "ўміратварэння і патурання" агрэсару. Няма аднадумнасці ў пытанні аб сціплым удзеле польскай дыпламатыі ў палітыцы калектыўнай бяспекі ў Еўропе, абвешчанай Лігай Нацый, яе супярэчлівых адносінах з Вялікабрытаніяй і Францыяй, Літвой і іншымі дзяржавамі. Увогуле, нягледзячы на некаторыя рознагалоссі, сучасныя польскія гісторыкі імкнуцца да ўсебаковага, аб'ектыўнага аналізу геапалітычнага становішча II Рэчы Паспалітай у перадваенны перыяд.

## БІБЛІЯГРАФІЯ


Batowski H. Zachód wobec granic Polski, 1920—1940. Łódź, 1995.

Batowski H. Zdrada monachijska. Sprawa Czechosłowacji i dyplomacja europejska w roku 1938. Poznań, 1973.

Batowski H. Sytuacja międzynarodowa polski 1938—1939. Między konferencja monachijska a wybuchem wojny // Polska, Niemcy, Europa w 1939 r. Materialy sesji zorganizowanej w Universytecie Yagiellońskim 14 grudnia 1989 r. z okazji 50 rocznicy wybuchu II wojny światowej / Pod. red. Michała Pułaskiego. Univ. Jagiel., Prace Historyczne. Kraków, 1991. Z. 99. S. 17—29.

Beck J. Ostatni raport / Przedmowa M. Wojciechowski, opracowanie, przypisy i indeks A. Skrzypek. Warszawa, 1987.

Cienciała A. M. Polska w polityce brytyjskiej i francuskiej w 1939 roku: wola walki czy próba unikniecia wojny? // Zeszyty Historyczne. 1986. Z. 75. S. 152—183.

Cienciała A. M. Polska w polityce Wielkiej Brytanii w przededniu wybuchu II wojny światowej // Kwartalnik Historyczny. 1990. N 1—2. S. 71—104.

Cimek H. Komuniści, Polska, Stalin 1918—1939. Białystok, 1990.

Czubiński A. Rola Wielkopolska i Poznańia w kształtowaniu zachodnich i północnych granic odrodzonego państwa polskiego (1918—1921) / Polska myśl zachodnia w Poznaniu i Wielkopolsce. Jej rozwój i realizacja w wiekach XIX—XX. (Red. nauk. A. Kwilecki). Warszawa; Poznań, 1980. S. 63—127.

Denbicki R. Foreign Policy of Poland 1919—1939. From the Rebirth of the Polish Republic to World War II. New York, 1962.

Dmowski R. Polityka polska i odbudowanie państwa. T. 1, 2. (Przedmowa i komentarz T. Wituch). Warszawa, 1988.

Dmowski R. Niemcy, Rocij i kwiectia polska. Lwow, 1908.

Drewniak W. Problematyka wschodniopruska w propagandzie niemieckiej okresu międzywojennego // Komunikaty Mazursko-Warmińskie. 1980. N 1. S. 41—51.

Garlicki A. Józef Piłsudski. 1867—1935. Warszawa, 1989.

Godlewski J.R. Wybrane zagadnienia polskiego planowania wojennego w latach 1919—1939. Gdańsk, 1982.

Gregorowicz S. Polsko-radzieckie stosunki polityczne w latach 1932—1935. Wrocław, 1982.

Gregorowicz S., Zacharias M. Polska—Związek Sówiecki (1932—1939). Warszawa, 1995.

Grünberg K., Serczyk J. Czwarty rozbiór Polski. Z dziejów stosunków radziecko-niemieckich w okresie międzywojennym. Warszawa, 1990.

Historia Polski. T. 4, cz. III, (rozdz. XXVI—XXXVI: 1926—1936), (makieta, pod red. T. Jędruszczaka). Warszawa, 1978; cz. IV, (rozdz. XXXVI—XXXIX: 1936—1939), (makieta, pod. red. T. Jędruszczaka). Warszawa, 1978.

Holzer J. Mozaika polityczna Drugiej Rzeczypospolitej. Warszawa, 1974.

Jackiewicz H. Gwarancje brytyjskie dla Polski w 1939 roku. Olsztyn, 1980.

Jędrzejewicz W. Józef Piłsudski 1867—1935. London: Życiorys, 1984.

Kamiński M., Zacharias M. W cieniu zagrozeniá. Polityka zagraniczna RP 1918—1939. Warszawa, 1993.

Karski J. Wielkie Mocarstwa wobec Polski 1919—1945. Od Wersalu do Jałty. Warszawa, 1992.

Karski J. The Great Powers and Poland 1918—1945. From Versailles to Yalta. London, 1985.

Kasparek J. Przepust Karpacki. Tajna akcja polskiego wywiadu. Warszawa, 1992.

Kowalski W.T. Ostatni rok Europy (1939). Warszawa, 1989.

Kowalski W.T., Skrzypek A. Stosunki polsko-radzieckie 1917—1945. Warszawa, 1980.

Kowalszyk J. Za kulisami wydarzeń politycznych z lat 1936—1938. Warszawa, 1976.

Kozeński J. Monachium 1938 w historiografii // Studia Historica Slavo-Germanica. Univ. im. Adama Mickiewicza w Poznańiu. Instytut Historii. Poznań, 1979. T. VIII. S. 164—179.

Krasuski J. Między wojnami. Polityka zagraniczna II Rzeczypospolitej. Warszawa, 1985.

Krasuski J. Stosunki polsko-niemieckie 1871—1939. Warszawa, 1967.

Krasuski J. Rola Ligi Narodow w kształtowaniu stosunkow polsko-niemieckich 1918—1939 // Problem polsko-niemieckie w Traktacie Wersalskim. Poznań, 1963. S. 553—630.

Krasuski J. Stosunki polsko-niemieckie 1918—1939. Przyaźnie i antagonizmy // Stosunki Polski z państwami sąsednimi w latach 1918—1939 / Pod red. J. Żarnowskiego. Wrocław, 1977. S. 177—216.
Kwiatkowski E. Józef Beck // Rzeczpospolita Niepodległa. 1988. N 1. S. 68—89.
Kwiatkowski E. W takim zyliśmy świecie. Sylwetki polityków. Kraków, 1990.
Kwilecki A. Geneza i oddziaływanie wielkopolskiego ośrodka myśli zachodnej w ujęciu socjologicznym // Polska myśl zachodnia w Poznańiu i Wielkopolsce. Jej rozwój i realizacja w wiekach XIX—XX / Red. nauk. A. Kwilecki. Warszawa; Poznań, 1980. S. 5—21.
Labuda G. Polska granica zachodnia. Tysiąc lat dziejów politycznych. Poznań, 1971.
Leczyk M. Polska i sąsiedzi. Stosunki wojskowe (1921—1939). Białystok: Wydawnictwo Filii Universytetu Warszawskiego. 1997.
Lipski J. Diplomat in Berlin 1933—1939. Papers and Memoirs of Jozef Lipski, Ambassador of Poland / Ed. by W. Jedrzejewicz. New York; London, 1968.
Liszewski K. Szawłowski R. Wojna polsko-sowiecka 1939. London, 1986.
Łossowski P. Dyplomacja Drugiej Rzeczypospolitej. Warszawa, 1992.
Łossowski P. Polska w Europie i świecie 1918—1939. Szkice z dziejów polityki zagranicznej i położenia międzynarodowego II Rzeczypospolitej. Warszawa, 1990.
Łossowski P. Litwa a sprawy polskie 1939—1940. Wyd. II. Warszawa, 1992.
Łossowski P. Stosunki polsko-estońskie 1918—1939. Gdańsk, 1985.
Łopatniuk S. Polsko-radzieckie stosunki gospodarcze 1921—1939. Warszawa, 1987.
Łojek J., Jerzewski L. Agresja 17 wrzesnia 1939, studium aspektów politycznych. Warszawa, 1990.
Łuczak C. Od Bismarka do Hitlera. Polsko-niemieckie stosunki gospodarcze. Poznań, 1988.
Łukasiewicz J. Ambassador of Poland / Ed. by W. Jendrzejewicz. New York; London, 1970.
Łukasiewicz J. Dyplomata w Paryżu 1936—1939 / Wspomnienia i dokumenty Juliusza Łukasiewicza ambasadora Rzeczypospolitej Polskiej. (Wydanie rozszerzone opracowali W. Jędrzejewicz i H. Bulhak). Londyn, 1989.
Łyczko-Grodzicka B. Dyplomacja polska a Ententa Balkańska 1933—1936. Wrocław, 1981.
Meysztowicz J. Czas przeszly dokonany / Wspomnienia ze służby w Ministerstwie Spraw Zagranicznych w latach 1932—1939. Kraków, 1984.
Michowicz W. Genewska konferencja rozbrojeniowa 1932—1937 a dyplomacja polska. Łódź,1986.
Mikos S. Działalność komisariatu Generalnego Rzeczypospolitej Polskiej w Wolnym Mieśce Gdańsku 1920—1939. Warszawa, 1972.
Ministrowie spraw zagranycznych II Rzeczypospolitej. (Praca zbior. pod red. J. Pajewskiego). Szczecin, 1992.
Mroczko M. Polska myśl zachodnia (1918—1939). Poznań: Instytut zachodni, 1986.
Nowak-Kiełbikowa M. Polska i Wielka Brytania w dobie zabiegów o zbiorowe bezpieczenstwo w Europie 1923—1937. Warszawa, 1989.
Nurek M. Polska w polityce Wielkiej Brytanii w latach 1936—1941. Warszawa. 1983.
Orlofa E. Dyplomacja polska wobec sprawy słowackiej w latach 1938—1939. Kraków, 1980.
Orlofa E. Kwestia słowacka w polskiej polityce zagranicznej w latach 1938—1939. Rzeszów, 1977.
Orlofa E. Polska działalność polityczna, dyplomatyczna i kulturna w Słowacji w latach 1919—1937. Rzeszów, 1984.
Orzechowski M. Idea zachodnia w myśli politychnej Wielkopolski (1918—1939) // Kronika Wielkopolski. 1975. N 2/3. S. 13—37.
Pajewski J. Odbudowa państwa polskiego 1914—1918. Warszawa, 1978.
Piszczkowski T. Anglia a Polska 1914—1939 w swietle dokumentów brytyjskich. London, 1975.
Polska Niepodległa (1918—1939). Wszechnica Polskiej Akademii Nauk. Warszawa; Kraków; Gdańsk; Łódź, Wrocław, 1984.
Polska, Niemcy, Europa w 1939 r. // Materialy sesji zorganizowanej w Universytecie Jagiellonskim 14 grudnia 1989 r w okazji 50 rocznicy wybuchu II wojny światowej / Pod red. Michala Pułaskiego. Univ. Jagiel. Praca Historiczna. Kraków, 1991. Z. 99.
Polska polityka zagraniczna w latach 1926—1939. Na podstawie tekstów min. Józefa Becka opracowala A. M. Cienciała. Paryż, 1990.
Póbog-Malinowski W. Najnowsza historia polityczna Polski 1864—1945. T. II. 1919—1939. London, 1956.
Polonsky A. Politics in Independent Poland 1921—1939. The Crisis of Constitutional Government. Oxford, 1972.
Prazmowska A. Poland and Eastern Front, 1939. Cambridge, 1987.
Problem granic i obszaru odrodzonego państwa polskiego 1918—1990 / Pod red. A. Czubińskiego. Poznań, 1990.
Raina P. Stosunki polsko-niemieckie 1937—1939. Prawdziwy charakter polityki zagranicznej Józefa Becka. London, 1975.
Rok 1938: Aneksja Austrii i Monachium / Materialy Międzynarodowej sesji naukowej, 7—8 grudnia 1983 r. (Pod red. Henryka Batowskiego). Zeszyty Naukowe Universitetu Jagiellonskiego. Prace Historyczne // Studia Polono-Danubiana et Balcanica II. Kraków, 1987. Z. 83.
Schimitzek S. Drogi i bezdroża minionej epoki. Wspomnienia z lat pracy w MSZ (1920—1939). Warszawa, 1976.
Skrzypek A. Nie spelniony sojusz? Stosunki sowiecko-niemieckie 1917—1941. Warszawa, 1992.
Ślusarczyk Jacek. Polska a państwo Radzieckie, 1918—1939. Kalendarium. Warszawa, 1996.
Sowa A.L. U progu wojny (z dziejów spraw wewnętrznych i polityki zagranicznej II Rzeczypospolitej). Kraków, 1997.
Starzeński P. Trzy lata z Beckiem. (Przedmowa i przypisy B. Grzeloński). Warszawa, 1991.
Terlecki A. Pułkownik Beck. Kraków, 1985.
Wandycz P. Stany Zjednoczone a Europa Środkowo-Wschodnia w okresie międzywojennym 1921—1939. Paryż, 1976.
Wandycz P. Polish Diplomacy 1914—1945: Aims and Achievements. London, 1988.
Wandycz P. Polska a zagranica. Paryż, 1986.
Wandycz P. The Twilight of French Eastern Alliances 1926—1936. French-Czechoslovak-Polish Relations from Locarno to the Remilitarizations of the Rhineland. Princeton, New Jersey, 1988.
Wandycz P. Z dziejów dyplomacji. London, 1988.
Wandycz P. August Zaleski, minister spraw zagranicznych RP (1926—1932) w świetle wspomnien i dokumentów. Paryż, 1980.
Wapiński R. Roman Dmowski. Lublin, 1988.
Wapiński R. Życie polityczne Pomorza w latach 1920—1939. Warszawa, 1983.
Wapiński R. Endecja na Pomorzu 1920—1939. Gdańsk, 1966.
Wapiński R. Endecja wobec hitleryzmu i III Rzeszy // Polska—Niemcy—Europa. Studia z dziejow myśli politycznej i stosunków międzynarodowych / Praca zbiorowa pod red. A. Czubińskiego. Poznań, 1977. S. 531—543.
Wapiński R. Miejsce Narodowej Demokracjii w życiu politycznym II Rzeczypospolitej // Dzieje Najnowsze, 1969. N 1. S. 47—62.
Wieczorkiewicz P.P. Polityka zagraniczna II Rzeczypospolitej na tle sytuacji europejskiej w latach 1918—1939 (Material pomocniczy dla nauczycieli historii). Warszawa, 1982.
Wodzicki R. Wspomnienia. Gdańsk—Warszawa—Berlin (1928—1939). Warszawa, 1972.
Wojciechowski M. Stosunki polsko-niemieckie 1933—1938. Wyd. II popr. Poznań, 1980.
Wrzesiński W. Niemcy w polskiej politycznej myśli 1864—1914. Główne nurty / Polska i jej sąsiedzi. (Pod red. H. Zielińskiego). T. 1. Wrocław, 1975. S. 67—118.
Zacharias M. Polska wobec zmian w układzie sił politycznych w Europie w latach 1932—1936. Wrocław, 1981.
Zacharias M. Józef Beck i "polityka równowagi" // Dzeje Najnowsze, 1988. N 2. S. 3—37.
Zacharias M. Kwestia spodziewanej wojny w stanowisku władz i opinii publicznej Czechosłowacji, Polski i Jugosławii w okresie międzywojennym // Przegląd Historyczny, 1991. Z. 1. S. 107—123.
Zacharias M. Pakt Ribbentrop-Mołotow w dokumentach estońskich // Kwartalnik Historyczny, 1991. N 4. S. 105—116.
Zacharias M. Przesłanki polityki Związku Sowieckiego wobec Polski w 1939 r. // Dzieje Najnowsze, 1992. N 1—2. S. 59—78.
Zaremba P. Historia Dwudziestolecia (1918—1939). Wrocław; Warszawa; Kraków, 1991.
Zaremba P. Historia dwudziestolecia (1918—1939) / Do druku przygot. M. Latyński. T. I—II. Paryż, 1981.
Z dziejow Drugiej Rzeczypospolitej / Praca zbior. pod red. Garlickiego. Warszawa, 1986.

Zgórniak M. Europa w przededniu wojny: Sytuacja militarna w latach 1938—1939. Kraków, 1993.
Zieliński H. Historia Polski 1914—1939. Wyd. II. Wrocław, 1985.
Zieliński H. Sprawa polskich ziem i granic zachodnich w polskiej politycznej XIX i XX wieku // Narod i państwo. Prace ofiarowane Henrykowi Jabłońskiemu w 60 rocznicę urodzin. Warszawa, 1969. S. 407—423.
Źarnowski J. "Lewica sanacyjna" w latach 1935—1939 // Przegląd Historyczny, 1958. N 4. S. 714—737.

## ЗБОРНІКІ ДАКУМЕНТАЎ

Dokumenty z dziejów polskej polityki zagranicznej 1918—1939 / Predmowa T. Jędruszczaka, redakcja naukowa T. Jędruszczaka i M. Nowak-Kiełbikowa (przy wspóludziale L. Grosfelda, P. Staweckiego i M. Zachariasa). T. 1. 1918—1932. Warszawa, 1989.
Documents of Germen Foreign Policy (1937—1945). Washington, 1966. Series D, Vol. V, N 18.
Kumaniecki J. Stosunki Rzeczypospolitiej Polskiej z państwem radzieckim 1918—1943. Wybór dokumentów. Warszawa, 1991.
Landau Z., Tomaszewski J. Monachium 1938. Polskie dokumenty dyplomatyczne. Warszawa, 1985.
Polish White Book. Official Documents concerning Polish-Germen and Polish-Soviet Relations 1933—1939. New York, 1940. N 32.
Sciśle tajny raport Lipskiego z 25 stycznia 1934. AMSZ Drugiej Rzeczypospolitej. P. III, N 47, 48.

## SUMMARY

**"Foreign Policy of the II Rzech Pospolita in 1932—1939 (Review of Polish Historical Scientific Literature of 1980—1990)" (Ludmila Drojja)**

The article gives a brief survey of the most significant monograph studies of Polish historians published in 1980—1990s on basic directions of the foreign policy of the II Rzech Pospolita in 1920s till the beginning of World War II.

The author systematizes the works of Polish historians dividing them into three academic schools:

1. The Academy of Science of Poland, the Warsaw University.
2. Poznan Western Institue, A. Mickiewicz University, academic centers in Wroclav, Lodz, Szczetin.
3. The Krakov (Yagellon) University.

Besides, a significant part of bibliography of the given period is comprised by monographs, social and political journalism and also the memoirs of Polish authors published abroad (in the UK, the USA, France).

The article is followed by the bibliography list of 110 works.